СУСТРЭЧЫ




# ЛІДСКІ НАПРАМАК

**18 лістапада ў Лідзе прайшло цікавае літаратурнае мерапрыемства. Тутэйшыя аматары мастацтва слова ў чарговы раз сабраліся ў літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет», якая штомесяц ладзіцца ў памяшканні крамы «Книжный мир». Да іх далучыліся гродзенскія калегі.**

Такія творчыя сустрэчы адбываюцца тут рэгулярна яшчэ з «дапандэмійных» часоў. Гэта ініцыятыва лідскіх паэтаў Руслана і Святланы Півавараваых. Нагадаем, што аналагічныя мерапрыемствы – сустрэчы з сучаснымі аўтарамі праходзяць у кнігарнях горада Мінска «Академкнига» і «Светоч». Лідскі «Книжный мир» з'яўляецца пакуль адзіным спецыялізаваным гандлёвым прадпрыемствам Гродзеншчыны, у якім рэгулярна засядае літаратурная гасцёўня. Тут гуртуюцца сапраўдныя сябры і аднадумцы, людзі рознага ўзросту, прадстаўнікі розных прафесій, захопленыя мастацтвам, аб'яднаныя любоўю да слова. Абмяркоўваюць кніжныя навінкі, адзначаюць юбілейныя літаратурныя даты, чытаюць услых уласныя творы, дзеляцца ўражаннямі ад прачытанага. Прыходзяць сюды нават члены розных творчых саюзаў і літаб'яднанняў, напрыклад, Лідскага раённага літаб'яднання «Суквецце» (кіраўнік журналіст «Лідскай газеты», беларускі паэт Алесь Мацулевіч). Такія астраўкі любові да вытанчанай славеснасці, да шчырых культурных размоў «вочы ў вочы» неабходныя людзям, каб не збяднець душой у свеце віртуальных выгод, дзе ўзаемныя чалавечыя цеплыня, дабрыня, увага, на жаль, становячыся дэфіцытам, падымаюцца ў цане. За магчымасць існавання ў гэтай кніжнай краме горада Ліды такога запаведніка гуманізму і духоўнасці яшчэ і яшчэ раз дзякуем дырэктару прадпрыемства Галіне Аляксандраўне Станевіч. Прадстаўнікі Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі пабывалі тут вясной, 18 сакавіка 2023 года – наведалі прэзентацыю дэбютнай кнігі вершаў Святланы Піваваравай «Люблю… Как много и как мало…»,

павіншавалі паэтэсу і падзяліліся ўласнай творчасцю з лідскімі сябрамі. Цяпло ад успамінаў аб той сустрэчы яшчэ не паспела астыць…




І вось ужо асенні літаратурны дэсант з Гродна. 18 лістапада ўдзельнікамі літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет» сталі паэтэсы Кацярына Каламійцава, Антаніна Нурэтдзінава і член Саюза пісьменнікаў Беларусі Дзмітрый Радзівончык. Паэт публіцыст, намеснік старшыні Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ па чарзе прадставіў паэтэс з горада над Нёманам, слову кожнай з якіх уласцівы ўнікальны аўтарскі стыль. У гэтым змаглі пераканацца ўдзельнікі лістападаўскай літаратурнай сустрэчы ў кніжнай краме. На правах ветлівага гаспадара і вядучага мерапрыемства гасцей прадставіў аўдыторыі адзін з арганізатараў грамадска-культурнага праекта, паэт Руслан Піваварaў.

Лаўрэата IV Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі (Алаізы Пашкевіч) у намінацыі «Адкрыццё года», маці трох сыноў, паэтэсу Кацярыну Каламійцаву *(на фота)* многае звязвае з Лідай, тут жывуць яе сваякі. Таму паэтэса лічыць горад таксама сваім, з нагоды 700-годдзя Ліды стварыла некалькі прысвячэнняў гораду-юбіляру і яго жыхарам. Творы-прысвячэнні ў выкананні аўтара прагучалі на лістападаўскай сустрэчы ў літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет». Паэтэса прачытала таксама аўтарскія творы з грамадзянскай, філасофскай і інтымнай лірыкі. Самым яркім момантам стаў фінал выступлення Кацярыны, калі падчас дэкламацыі свайго верша пад назвай «Танец», паэтэса перайшла на спевы. У верасні бягучага года Кацярына Каламійцава выступіла ў Лідскай цэнтральнай раённай бібліятэцы на пасяджэнні Лідскага раённага літаратурнага аб’яднання «Суквецце».






Антаніна Нурэтдзінава *(на фота)* прыехала ў Ліду ўпершыню. Паэтэса з'яўляецца пераможцам Рэспубліканскага конкурсу маладых паэтаў «Мы рождены для вдохновенья» (Брэст, 2021). Гродзенская госця крыху сама расказала пра сябе, пра свае захапленні і прыярытэты ў творчасці. Прагучалі аўтарскія творы, сярод якіх пераважалі філасофскія вершы-роздумы, натхнёныя рамантыкай беларускай восені. Найбольш эфектным і самым кранальным эпізодам у выступленні Антаніны стала чытанне яе аўтарскага перакладу вядомага верша Расула Гамзатава «Журавли» да 100-годдзя з дня нараджэння класіка савецкай паэзіі, твора, з якім паэтэса трапіла ў тройку аўтараў найлепшых перакладаў твора на беларускую мову (Рэспубліканскі конкурс паэтычных перакладаў «Сожскія берагі дружбы», Гомель, 2023).



Дзмітрый Радзівончык пазнаёміў прысутных з некаторымі калектыўнымі і міжнароднымі кнігавыдавецкімі праектамі Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ, прачытаў некалькі аўтарскіх твораў розных гадоў на рускай і беларускай мовах, запрасіў лідскіх сяброў да супрацоўніцтва з афіцыйным інтэрнэт-сайтам ГрАА СПБ. У кожнага з наведвальнікаў лістападаўскай літаратурнай гасцёўні была магчымасць набыць кнігі гасцей з аўтарскім аўтографам на памяць аб сустрэчы. І, на шчасце, гэта адбылося. Цяпер у Лідзе ў нас ёсць не толькі сябры-аднадумцы, але і чытачы.

Слова атрымалі гаспадары. Вядучы пасяджэння Руслан Піварараў па традыцыі агучыў некалькі знакавых літаратурных падзей і юбілейных дат. Надышоў хвалюючы момант – свае вершы прачыталі лідскія паэты: Алесь Мацулевіч, Алена Несцерава, Вольга Верасняк, Ала Юшко, Ганна Рэлікоўская, Таццяна Сямёнава. Ветэран літаратурнага руху Уладзімір Дронаў прадэкламаваў свой улюбёны верш Аляксандра Блока з нагоды юбілею класіка. Святлана Піварарава выступіла з прэзентацыяй песні на ўласныя словы. Адбыліся цікавыя культуралагічныя і нават сацыяльна-філасофскія дыскусіі. Усталявалася чароўная атмасфера ўзаемнай прыязнасці. Усім прысутным было вельмі прыемна, неяк па-сяброўску цёпла і ўтульна разам. Калі ласка, глядзіце фота ніжэй, запамінайце гэтыя твары і імёны. Перад вамі сапраўдныя сябры, якія заўсёды будуць рады вам. Такім, якія вы ёсць. Сустрэчы ў літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет» (г. Ліда) будуць працягвацца. У тым ліку і з удзелам гродзенскіх гасцей. Няма сумневаў у тым, што Лідскі літаратурны напрамак – гэта шлях сяброўства.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

**Фота** Руслана Піваварава і Святланы Піваваравай



**Выступае Уладзімір Дронаў**



**Выступае Таццяна Іванаўна Сямёнава**



**Ганна Рэлікоўская**



**Вольга Верасняк**



**Ала Юшко**



**Паэт Алесь Мацулевіч выступіў з вершамі, прысвечанымі юбілею «Лідскай газеты» і 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў**



**Выступае**
**Алена Несцерава**




**Адзін з арганізатараў літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет», вядучы імпрэзы, паэт Руслан Півавараў (Ліда)**




**Паэтэса Святлана Піваварава (Ліда) выступіла з прэзентацыяй песні на яе словы, створанай літаральна напярэдадні сустрэчы**










**Выступае паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык (Гродна)**


Нет Никого Краше Него
поэзия
Женщина в красном
Песнярам Айчыны
Навстречу попутному ветру
Река безбрежная
Дмитрий Радиончик
Дым без огня
Пиррова техника
БОГАТСТВО от ЛЮБВИ
РАССВЕТ
КИНГ


Нет Никого Краше Него
поэзия
Женщина в красном
Песнярам Айчыны
Навстречу попутному ветру
Река безбрежная
Дым без огня
Пиррова техника
БОГАТСТВО от ЛЮБВИ
Минская


КТО мы такие?
ЧТО сегодня на обед?
КУРОЧКА РЯБА
Кто живёт в лесу
Нет Никого
Женщина в красном
ПЕСНЯРАМ ДИЧЫНЫ
ДЫМ БЕЗ ОГНЯ


CLASSIC
A hoodie (also spelled hoody) is a
sweatshirt or a jacket with a hood.
The hooded sweatshirt is a utilitarian
garment that originated in the 1930s for
workers in cold warehouses. Hoodies
were later adopted by hip hop culture
as a symbol of what one supporter termed
"cool anonymity and vague menace."
The term «hoodie» entered popular
usage in the 1990s.




проза
замежная
літаратура
класіка